

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
01.12.2023 № 531

СТАТУТ
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

БДПУ

УСТАВ
учреждения образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

БГПУ

Новая рэдакцыя

Мінск 2023

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (у далейшым – БДПУ) створана ў адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, зацверджаным Дэкрэтам ад 16.01.2009 № 1 «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», і іншымі актамі заканадаўства.

2. Гэты Статут з'яўляецца новай рэдакцыяй Статута БДПУ, зацверджанага загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 жніўня 2012 года № 640 і зарэгістраванага Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам 13 жніўня 2012 года, рэгістрацыйны нумар 100302394.

3. Назва юрыдычнай асобы:

поўная:

на рускай мове: учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»;

на беларускай мове: установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;

на англійскай мове: educational institution «Belarusian state pedagogical university named after Maxim Tank»;

скарочаная:

на рускай мове: БГПУ;

на беларускай мове: БДПУ;

на англійскай мове: BSPU.

4. Месца знаходжання БГПУ: вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск.

5. БДПУ адносіцца да тыпу ўстановы вышэйшай адукацыі, від – універсітэт.

БДПУ мае права ўдзельнічаць у конкурсным адборы на прадастаўленне ўніверсітэту статусу «вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі».

6. БДПУ з’яўляецца дзяржаўнай установай, фінансуемай з рэспубліканскага бюджэту.

7. Заснавальнікам БДПУ з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

8. БДПУ з’яўляецца навуковай арганізацыяй (пасведчанне аб акрэдытацыі навуковай арганізацыі ад 22.11.2022 № 166, выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі).

9. БДПУ:

9.1. з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваім найменнем, адпаведныя бланкі і штампы, іншыя неабходныя для ажыццяўлення дзейнасці рэквізіты, самастойны баланс, рахункі ў банку, у тым ліку валютныя, а таксама ўласную сімволіку, заснаваную ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

9.2. адказвае па сваіх абавязацельствах грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць па яго абавязках нясе ўласнік маёмасці;

9.3. мае права ва ўстаноўленым парадку заключаць дагаворы, якія адпавядаюць мэтам яго дзейнасці, набываць і ажыццяўляць маёмасныя і немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе.

10. БДПУ з’яўляецца пераемнікам Мінскага настаўніцкага інстытута, створанага Указам імператара Расійскай Імперыі Мікалая II ад 22 чэрвеня 1914 года (Міністра народнай адукацыі Расійскай Імперыі), афіцыйнае адкрыццё якога адбылося 21 лістапада таго ж года.

На падставе рашэння Першага Усерасійскага з’езда па асвеце, які адбыўся ў жніўні 1918 года, і ў адпаведнасці з цыркулярам НКА РСФСР у пачатку 1919 года Мінскі настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў вышэйшую педагагічную навучальную ўстанову – Мінскі педагагічны інстытут з 4-гадовым тэрмінам навучання.

Летам 1919 года Мінскі педагагічны інстытут перайменаваны ў Беларускі педагагічны інстытут (адзінаццаць месяцаў інстытут функцыянаваў пад польскай уладай).

У 1920 годзе адбылася рэарганізацыя Беларускага педагагічнага інстытута ў Мінскі інстытут народнай адукацыі.

Мінскі інстытут народнай адукацыі быў закрыты ў пачатку 1922 года, а яго студэнты і выкладчыкі былі пераведзены ў створаны ў лістападзе 1921 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (у далейшым – БДУ).

Восенню 1922 года ў БДУ быў створаны педагагічны факультэт.

Паводле пастановы Савета Народных Камісараў Беларускай ССР ад 7 ліпеня 1931 года № 215, загадам Наркамасветы БССР ад 28 ліпеня 1931 года № 142 педагагічны факультэт БДУ рэарганізаваны ў Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут.

У 1935 годзе Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут перайменаваны ў Мінскі педагагічны інстытут. У жніўні 1936 года Мінскаму педагагічнаму інстытуту прысвоена імя А.М.Горкага.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 верасня 1993 года № 611 Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 кастрычніка 1995 года № 414 «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Беларусі Героя Сацыялістычнай Працы Максіма Танка (Скурко Я.І.)» БДПУ прысвоена імя Максіма Танка.

На падставе загада Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 студзеня 2004 года № 29 «Аб рэарганізацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» да БДПУ далучана ў якасці адасобленага структурнага падраздзялення Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф.Скарыны».

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 2004 года № 744 «Аб прыёмцы з камунальнай уласнасці ў рэспубліканскую ўласнасць устаноў адукацыі» і загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2004 года № 747 «Аб прыёмцы ўстаноў адукацыі з камунальнай уласнасці ў рэспубліканскую ўласнасць» з камунальнай уласнасці г. Мінска ў рэспубліканскую перададзена ўстанова адукацыі «Мінскі дзяржаўны педагагічны каледж № 2 імя М.Танка».

Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2004 года № 828 «Аб рэарганізацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны педагагічны каледж № 2 імя М.Танка» далучана да БДПУ.

БДПУ з’яўляецца праваперaемнікам правоў і абавязкаў далучаных да яго юрыдычных асоб у адпаведнасці з перадатачнымі актамі.

11. 21 лістапада – дзень афіцыйнага адкрыцця Мінскага настаўніцкага інстытута, пераемнікам якога з’яўляецца БДПУ, – штогод адзначаецца калектывам універсітэта як Дзень БДПУ.

12. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, упаўнаважаным уласнікам кіраваць маёмасцю БДПУ, з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і БДПУ падпарадкоўваецца Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь.

13. Да кампетэнцыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адносіцца:

стварэнне БДПУ, зацвярджэнне яго статута, прыняцце рашэнняў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у статут, аб рэарганізацыі і ліквідацыі БДПУ;

дача згоды БДПУ на распараджэнне замацаванай за ім маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт выдзеленых яму заснавальнікам сродкаў;

прыняцце мер па пераводзе навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі ў выпадку спынення дзейнасці БДПУ, анулявання, спынення дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на адукацыйную дзейнасць БДПУ (па яго

адасобленых падраздзяленнях, у дачыненні да адной або некалькіх работ і (або) паслуг, якія складаюць адукацыйную дзейнасць);

прыняцце рашэння аб змяненні віду БДПУ,

іншыя правы і абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам.

14. БДПУ ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дадзеным Статутам, нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і іншымі актамі заканадаўства.

15. БДПУ можа ўваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый ў парадку, які вызначаецца актамі заканадаўства.

16. У БДПУ не дапускаюцца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне, ананімная або іншая супярэчная заканадаўству дзейнасць рэлігійных арганізацый.

ГЛАВА 2
ПРАДМЕТ, МЭТА І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ БДПУ

17. Прадметам дзейнасці БДПУ з'яўляецца рэалізацыя адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, выкананне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў па шырокім спектры галін навукі, ажыццяўленне міжнароднага супрацоўніцтва, рэалізацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дарослых, адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

18. Мэты дзейнасці БДПУ:

фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў, інтэлектуальнага, маральнага, творчага і фізічнага развіцця навучэнцаў;

забеспячэнне рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян у сферы адукацыі, ажыццяўленне сацыяльна-культурных і іншых функцый у сферы адукацыі праз атрыманне вышэйшай, навукова-арыентаванай і дадатковай адукацыі на аснове непарыўнага адзінства адукацыйнага працэсу, навуковых даследаванняў; задавальненне патрэб грамадства ў кваліфікаваных спецыялістах, якія спалучаюць глыбокія прафесійныя веды з высокім узроўнем культуры і сацыяльнай актыўнасці, сфарміраванай грамадзянскай пазіцыяй і светаўспрыманнем праз рэалізацыю адукацыйных праграм у сферы вышэйшай, навукова-арыентаванай і дадатковай адукацыі, у тым ліку згодна з задачамі выхавання.

19. Мэты дзейнасці БДПУ дасягаюцца шляхам рэалізацыі наступных асноўных задач:

падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй;

падрыхтоўка навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі;

развіццё асобы навучэнцаў, іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей, фарміраванне ў іх кампетэнцый, неабходных для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы;

грамадзянскае, патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў;

арганізацыя і ажыццяўленне навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі; арганізацыя і правядзенне фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.

20. Правы і абавязкі БДПУ ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства і дадзеным Статутам.

21. БДПУ рэалізуе:

21.1 адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі:

адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй;
адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграваная з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 1;

адукацыйную праграму бакалаўрыята і бесперапынную адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 2;

адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі II ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы і забяспечвае атрыманне ступені магістра ў адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 3;

адукацыйную праграму магістратуры па спецыяльнасцях у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 4;

21.2 адукацыйныя праграмы навукова-арыентаванай адукацыі:

адукацыйную праграму аспірантуры па спецыяльнасцях у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 5;

адукацыйную праграму дактарантуры па спецыяльнасцях у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 6;

21.3 адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых:

адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па профілях адукацыі, напрамках адукацыі ў адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 7;

адукацыйную праграму перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па спецыяльнасцях у адпаведнасці з пералікам згодна з дадаткам 8;

адукацыйную праграму стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

адукацыйную праграму навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў і іншых відаў навучальных курсаў);

адукацыйную праграму курсаў мэтавага прызначэння;

адукацыйную праграму ўдасканалення магчымасцей і здольнасцей асобы;

адукацыйную праграму падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь;

21.4 адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Рэалізуемыя БДПУ адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, бакалаўрыята і бесперапынная адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі могуць інтэгравацца з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

22. БДПУ ажыццяўляе дзейнасць, якая прыносіць даходы, у адпаведнасці з пералікам відаў эканамічнай дзейнасці згодна з дадаткам 9.

23. БДПУ ажыццяўляе асобныя віды дзейнасці на падставе спецыяльных дазволаў (ліцэнзій).

У парадку, прадугледжаным заканадаўствам, БДПУ не ажыццяўляе рознічны гандаль алкагольнымі напоямі і тытунёвымі вырабамі ў вучэбных карпусах (будынках), дзе ажыццяўляецца адукацыйны працэс, у інтэрнатах.

ГЛАВА 3
СТРУКТУРА БДПУ

24. Структура і штатная колькасць работнікаў БДПУ зацвярджаецца рэктарам БДПУ ў адпаведнасці з заканадаўствам.

25. У склад БДПУ ўваходзяць вучэбныя, навукова-даследчыя, выхаваўчыя, сацыяльна-культурныя, адміністрацыйна-гаспадарчыя структурныя падраздзяленні, у тым ліку: факультэты і інстытуты, кафедры, лабараторыі, аспірантура і дактарантура, цэнтры, упраўленні, службы, аддзелы, сектары, бібліятэка, інтэрнаты, студэнцкі гарадок, спартыўны комплекс, іншыя структурныя падраздзяленні ў адпаведнасці са штатным раскладам, зацверджаным рэктарам БДПУ.

26. БДПУ мае адасобленае структурнае падраздзяленне: Гандлёвы комплекс БДПУ, вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск (загад рэктара БДПУ ад 5 жніўня 1997 года № 39).

27. Прававы статус і функцыі структурных падраздзяленняў вызначаюцца дадзеным Статутам, а таксама палажэннямі аб гэтых структурных падраздзяленнях, зацверджанымі рэктарам БДПУ.

28. БДПУ з’яўляецца юрыдычнай асобай, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі друкаваных перыядычных сродкаў масавай інфармацыі – шматтыражнай газеты «Настаўнік» (далей – Газета) і навукова-метадычнага часопіса «Весці БДПУ» (далей – Часопіс), а таксама іх выдаўцом і распаўсюджвальнікам.

29. Мэтай дзейнасці рэдакцыі Газеты і Часопіса з’яўляецца развіццё ўнутрыўніверсітэцкіх і знешніх камунікацый, фарміраванне і ўмацоўванне пазітыўнага іміджу БДПУ ў краіне і за яе межамі.

30. Рэдакцыю Газеты і Часопіса ўзначальвае галоўны рэдактар.

31. У рэдакцыі Газеты і Часопіса ствараецца рэдакцыйная калегія, члены якой прызначаюцца загадам рэктара БДПУ.

32. Газета і Часопіс фінансуюцца за кошт уласных сродкаў БДПУ.

33. Пры арганізацыі дзейнасці рэдакцыя Газеты і Часопіса кіруецца заканадаўствам.

34. Дзейнасць грамадскіх арганізацый у БДПУ ажыццяўляецца ў вызначаным парадку і ў адпаведнасці з заканадаўствам. Рэктар БДПУ ў адпаведнасці з заканадаўствам можа выдзяляць грамадскім арганізацыям памяшканні, абсталяванне і інвентар для ажыццяўлення іх статутнай дзейнасці.

ГЛАВА 4
КІРАВАННЕ БДПУ

35. Кіраванне БДПУ ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь, дадзеным Статутам, іншымі актамі заканадаўства і будуецца на спалучэнні прынцыпаў адзіначалля і самакіравання.

36. Непасрэднае кіраўніцтва дзейнасцю БДПУ ажыццяўляе рэктар, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ў парадку, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

37. Рэктар БДПУ ў межах сваіх паўнамоцтваў у адпаведнасці з дадзеным Статутам і іншымі актамі заканадаўства:

дзейнічае ад імя БДПУ без даверанасці пры прадстаўленні інтарэсаў і заключэнні здзелак і нясе адказнасць за вынікі сваёй дзейнасці, выдае загады і распараджэнні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі і навучэнцамі БДПУ, заключае дагаворы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках у межах сваёй кампетэнцыі;

ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў БДПУ, заключае (працягвае, скасоўвае) з імі працоўныя дагаворы (кантракты), прымяняе да іх меры заахвочвання, дысцыплінарнага спагнання;

прымае рашэнні па пытаннях фарміравання інстытутаў, факультэтаў, кафедраў, іншых структурных (у тым ліку адасобленых) падраздзяленняў, у парадку, устаноўленым заканадаўствам, зацвярджае іх структуру і штатны расклад БДПУ;

зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях БДПУ;

забяспечвае выкананне ўніверсітэтам і яго структурнымі (у тым ліку адасобленымі) падраздзяленнямі ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, забяспечвае умовы для правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі, кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі;

з’яўляецца старшынёй Савета БДПУ;

кіруе работай рэктарата;

удзельнічае ў дзейнасці Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі, каардынуе дзейнасць органаў самакіравання БДПУ;

прымае меры па стымуляванні працы педагагічных работнікаў і іншых работнікаў БДПУ, павышэнні кваліфікацыі педагагічных работнікаў, забяспечвае выкананне патрабаванняў артыкула 51 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

удзельнічае ва ўстаноўленым парадку ў фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму ў БДПУ;

забяспечвае захаванне заканадаўства аб ахове працы, а таксама бяспека арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу ў БДПУ;

забяспечвае выкананне БДПУ даведзенага паказчыка па экспарце паслуг;

у вызначаным парадку дэлегуе частку сваіх паўнамоцтваў прарэктарам, кіраўнікам структурных падраздзяленняў і іншым работнікам БДПУ;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, дадзеным Статутам.

Рэктар БДПУ мае права прадастаўляць студэнтам у перыяд атрымання вышэйшай адукацыі скідкі са сфарміраванага кошту навучання на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у парадку і памерах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляць перавод іх з платнага навучання на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту на ўмовах, якія ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і ў парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

38. У час адсутнасці рэктара яго абавязкі выконвае першы прарэктар або па загадзе адзін з прарэктараў.

39. Размеркаванне функцый і адказнасці паміж прарэктарамі БДПУ ўстанаўліваецца загадам рэктара БДПУ.

40. Даверанасць ад імя БДПУ выдаецца за подпісам рэктара БДПУ, першага прарэктара БДПУ або аднаго з прарэктараў (у адсутнасць рэктара).

41. Аператыўнае ўпраўленне БДПУ, каардынацыю дзейнасці структурных падраздзяленняў, вырашэнне бягучых пытанняў вучэбнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці ажыццяўляе рэктарат. Склад рэктарата, парадак яго дзейнасці вызначаецца рэктарам БДПУ.

42. Каардынацыя навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці БДПУ ажыццяўляецца прарэктарам па навуковай рабоце БДПУ, выхаваўчай (ідэалагічнай) работы – першым прарэктарам БДПУ.

43. Асноўным органам самакіравання БДПУ з'яўляецца Савет БДПУ, узначалены рэктарам БДПУ. Савет БДПУ ствараецца ў мэтах вырашэння асноўных пытанняў дзейнасці БДПУ.

Да кампетэнцыі Савета БДПУ адносяцца:

вызначэнне перспектыўных напрамкаў развіцця БДПУ, разгляд планаў работы БДПУ, пытанняў яго адукацыйнай і навуковай дзейнасці, міжнароднага супрацоўніцтва;

унясенне прапаноў аб удасканаленні структуры БДПУ, стварэнні адасобленых і (або) структурных падраздзяленняў БДПУ, спыненне дзейнасці адасобленага падраздзялення БДПУ, скасавання структурнага падраздзялення БДПУ, вызначэнне асноўных напрамкаў іх дзейнасці;

разгляд пытанняў абнаўлення і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы БДПУ, размеркавання замацаванай за БДПУ маёмасці паміж яго адасобленымі і (або) структурнымі падраздзяленнямі;

прыняцце рашэнняў па пытаннях арганізацыі адукацыйнага працэсу, абмеркаванне праектаў вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, праграмна-плануемай дакументацыі выхавання, што рэалізуюцца БДПУ;

разгляд пытанняў фарміравання кантынгенту навучэнцаў БДПУ;

умацаванне сувязі адукацыйнага працэсу з вытворчасцю, узаемаадносін БДПУ з арганізацыямі – заказчыкамі кадраў;

прадстаўленне кандыдатаў на пасаду дырэктара інстытута без права юрыдычнай асобы, дэкана факультэта;

абранне на пасаду загадчыка кафедры;

прыняцце рашэння па пытаннях развіцця навукі і супрацоўніцтва з установамі адукацыі і навуковымі арганізацыямі ў сферы навуковай дзейнасці;

разгляд пытанняў прадстаўлення да прысваення вучоных і ганаровых званняў, дзяржаўных узнагарод;

прысваенне вышэйшых званняў, устаноўленых у БДПУ;

садзейнічанне арганізацыі і правядзенню адукацыйных мерапрыемстваў;

заслухоўванне і зацвярджэнне справаздач рэктара БДПУ, яго намеснікаў (прарэктараў) па асноўных напрамках дзейнасці, кіраўнікоў адасобленых і (або) структурных падраздзяленняў БДПУ аб ходзе выканання планаў работы БДПУ, яго адасобленых і (або) структурных падраздзяленняў, выніках адукацыйнай, навуковай, гаспадарчай і іншых відаў дзейнасці, а таксама педагагічных работнікаў аб выніках стажыроўкі;

заслухоўванне штогадовых справаздач аб выкананні бюджэту БДПУ;

заслухоўванне справаздач кіраўнікоў навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ аб выніках навуковых даследаванняў;

зацвярджэнне тэматычных планаў навукова-даследчых работ, справаздач па выніках навукова-даследчых работ;

абмеркаванне тэматыкі і вынікаў эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў БДПУ;

зацвярджэнне прапанаваных саветамі інстытутаў/факультэтаў кандыдатур студэнтаў на атрыманне імянных стыпендый і стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

зацвярджэнне тэм дысертацый навуковых кіраўнікоў (кансультантаў), індывідуальных планаў работы;

разгляд вынікаў бягучай гадавой атэстацыі аспірантаў, дактарантаў, саіскальнікаў БДПУ;

зацвярджэнне нормаў часу для разліку аб’ёму вучэбнай работы прафесарска-выкладчыцкага саставу ў межах нормаў, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

зацвярджэнне сімволікі БДПУ;

разгляд вынікаў функцыянавання маніторынгу якасці дзейнасці БДПУ ў галіне бесперапыннай педагагічнай адукацыі;

разгляд іншых пытанняў, аднесеных да кампетэнцыі Савета БДПУ актамі заканадаўства.

44. Склад Савета БДПУ фарміруецца з прадстаўнікоў навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, кіраўнікоў адасобленых і (або) структурных падраздзяленняў БДПУ, педагагічных і іншых работнікаў БДПУ.

У склад Савета БДПУ могуць уваходзіць прадстаўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый – заказчыкаў кадраў, грамадскіх арганізацый і іншых арганізацый.

45. Агульная колькасць членаў Савета БДПУ складае не больш за 60 чалавек.

Колькасны склад Савета БДПУ фарміруецца ў наступнай прапорцыі:

25% – прадстаўнікі навучэнцаў БДПУ, іх законных прадстаўнікоў;

75% – прадстаўнікі кіраўнікоў адасобленых і (або) структурных падраздзяленняў БДПУ, педагагічных і іншых работнікаў БДПУ,

мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый – заказчыкаў кадраў, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый.

46. Персанальны склад Савета БДПУ зацвярджаецца загадам рэктара БДПУ.

47. Тэрмін паўнамоцтваў Савета БДПУ – пяць гадоў.

Парадак выбрання, склад і арганізацыя дзейнасці Савета БДПУ вызначаюцца Палажэннем аб Савеце БДПУ, зацверджаным рэктарам БДПУ.

48. Пасяджэнні Савета БДПУ лічацца паўнамоцнымі, калі на іх прысутнічае не менш за дзве трэці членаў савета. Рашэнні Савета БДПУ па пытаннях адукацыйнай, навуковай дзейнасці, абнаўлення і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў. Пры правядзенні конкурсаў на замяшчэнне пасад загадчыкаў кафедр і прадстаўленні для прысваення вучоных званнях рашэнні Савета БДПУ прымаюцца ў парадку, указаным у адпаведных палажэннях.

49. Рашэнні Савета БДПУ, якія не супярэчаць заканадаўству і зацверджаныя загадам рэктара БДПУ, з'яўляюцца абавязковымі для педагагічных і іншых работнікаў БДПУ, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

50. Непасрэднае кіраўніцтва інстытутам без права юрыдычнай асобы ажыццяўляе яго дырэктар, які прызначаецца на пасаду па прадстаўленні Савета БДПУ і вызваляецца ад пасады загадам рэктара БДПУ, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

51. Непасрэднае кіраўніцтва факультэтам ажыццяўляе яго дэкан, які прызначаецца на пасаду па прадстаўленні Савета БДПУ і вызваляецца ад пасады загадам рэктара БДПУ.

52. Непасрэднае кіраўніцтва кафедрай ажыццяўляе загадчык кафедры, які прызначаецца на пасаду пасля яго абрання Саветам БДПУ і вызваляецца ад пасады загадам рэктара БДПУ.

53. Асноўным органам самакіравання інстытута/факультэта БДПУ з'яўляецца савет інстытута/факультэта.

54. Нормы прадстаўніцтва ў савет інстытута/факультэта ад кафедраў, якія ўваходзяць у яго склад, парадак правядзення выбараў, а таксама асноўныя патрабаванні да членаў савета інстытута/факультэта вызначаюцца палажэннямі аб савеце інстытута/факультэта, якія зацвярджаюцца рэктарам БДПУ.

55. На факультэтах, інстытутах і ў інтэрнатах БДПУ могуць ствараца органы студэнцкага самакіравання – студэнцкія саветы. Прадстаўнікі калегіяльных органаў студэнцкага самакіравання выбіраюцца ў склад Савета БДПУ і саветаў інстытутах/факультэтаў.

56. Для разгляду пытанняў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу можа ствараццa навукова-метадычны савет.

57. З мэтай садзейнічання ў забеспячэнні дзейнасці і развіцця БДПУ можа ствараццa папячыцельскі савет.

58. Палажэнні аб навукова-метадычным савеце, апякунскім савеце, студэнцкім савеце зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 5
АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ Ў БДПУ

59. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ў БДПУ ажыццяўляецца ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі і вызначанымі ў Рэспубліцы Беларусь адукацыйнымі стандартамі.

60. Адукацыйны працэс у БДПУ арганізуецца на аснове:

прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

адукацыйных стандартаў;

дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, якія рэалізуюцца ў галінах эканомікі і сацыяльнай сферы інавацыйных праектаў;

педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

культурных і духоўных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

61. БДПУ забяспечвае атрыманне адукацыі ў вочнай (дзённай, вячэрняй), завочнай, дыстанцыйнай формах атрымання адукацыі і ў форме саіскальніцтва.

62. Навучанне ў БДПУ ажыццяўляецца на беларускай і рускай мовах, а таксама на замежнай мове пры наяўнасці ўмоў у парадку, вызначаным заканадаўствам.

63. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм ажыццяўляецца ў БДПУ ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, палажэннем аб адпаведным тыпе ўстановы адукацыі або яго відзе, вучэбна-праграмнай дакументацыяй адпаведных адукацыйных праграм, індывідуальнымі планамі працы магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў, саіскальнікаў, праграмамі-мінімум кандыдацкіх экзаменаў па спецыяльных дысцыплінах і ўключае ў сябе тэарэтычнае і практычнае навучанне, выхаваўчую работу, самастойную работу навучэнцаў, атэстацыю навучэнцаў.

Структура і змест падрыхтоўкі навучэнцаў, паслядоўнасць і тэрміны вывучэння вучэбных дысцыплін, колькасць вучэбных гадзін на тыдзень, віды вучэбных заняткаў, формы атэстацыі і іншыя патрабаванні ў

адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі вызначаюцца вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм, якія рэалізуюцца ўніверсітэтам, заканадаўствам.

64. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм у БДПУ ажыццяўляецца ў адпаведнасці і ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

Правядзенне вучэбных, лабараторных і іншых відаў заняткаў, практык, а таксама бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі ажыццяўляюцца ў БДПУ ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

На падставе рашэння рэктара БДПУ адукацыйны працэс можа ажыццяўляцца індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам.

65. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі, формы, парадак і ўмовы правядзення прамежкавай і выніковай атэстацый аспірантаў, дактарантаў, саіскальнікаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм навукова-арыентаванай адукацыі арганізуецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, якое зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

66. Навукова-метадычнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў БДПУ ажыццяўляецца ў адпаведнасці і ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

67. БДПУ ў перыяд навучання дае навучэнцам водпускі, віды, парадак і ўмовы прадастаўлення якіх вызначаны актамі заканадаўства.

68. У адпаведнасці з заканадаўствам і ў вызначаным ім парадку БДПУ ў тым ліку ажыццяўляе навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў.

69. Навучанне ў БДПУ ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

70. БДПУ ажыццяўляе рэалізацыю адукацыйных праграм за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і навучанне на платнай аснове. Навучанне на платнай аснове рэгулюецца лакальнымі прававымі актамі БДПУ. Кошт платнага навучання вызначаецца згодна з заканадаўствам.

71. БДПУ з'яўляецца каардынатарам навукова-метадычнай работы ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях, замацаваным за вучэбна-метадычнай аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі.

72. БДПУ праводзіць сістэмную ідэалагічную і выхаваўчую работу, якая ахоплівае вучэбную і пазавучэбную дзейнасць, уключаючы яе навукова-метадычнае, кадравае і арганізацыйна-структурнае забеспячэнне.

Ідэалагічная і выхаваўчая работа ў БДПУ ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства і дадзеным Статутам.

Выхаваўчы працэс ажыццяўляецца работнікамі БДПУ з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, іншымі педагагічнымі работнікамі ў працэсе вучэбных заняткаў, пазавучэбнай дзейнасці, а таксама ў інтэрнатах.

73. Каардынацыю і арганізацыю ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў інстытутах/факультэтах ажыццяўляюць дырэктары/дэканы, намеснікі дырэктараў/дэканаў па выхаваўчай рабоце, а на кафедрах – загадчыкі кафедр.

Арганізацыю ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДПУ ажыццяўляе ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, дзейнасць якога ажыццяўляецца на падставе Палажэння аб упраўленні выхаваўчай работы з моладдзю, зацверджанага рэктарам БДПУ.

74. Выхаваўчы працэс у БДПУ накіраваны на стварэнне ўмоў для найбольш поўнага раскрыцця творчага патэнцыялу навучэнцаў, пашырэння педагагічных уменняў і навыкаў, асобаснага станаўлення і развіцця навучэнцаў, фарміравання прафесійнай культуры будучых спецыялістаў, іх грамадзянскай пазіцыі, светаўспрымання і сацыяльнай актыўнасці, развіцця традыцый БДПУ.

Мэтай выхавання з'яўляецца фарміраванне рознабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца.

Задачы выхавання ў БДПУ рэалізуюцца ў сумеснай вучэбнай, навуковай, творчай, вытворчай і грамадзянскай дзейнасці педагагічных работнікаў БДПУ і навучэнцаў на аснове дзяржаўнай палітыкі па выяўленні і падтрымцы адоранай і таленавітай моладзі, дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

75. У мэтах урэгулявання рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін у выпадку ўзнікнення канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў БДПУ ствараецца камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

Рашэнне камісіі па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка з'яўляецца абавязковым для ўсіх удзельнікаў адукацыйных адносін у БДПУ і падлягае выкананню ў тэрміны, прадугледжаныя ўказаным рашэннем.

Парадак стварэння, арганізацыі работы, прыняцця рашэнняў камісіяй па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка і іх выканання ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 6

НАВУКОВАЯ, НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ І ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БДПУ

76. БДПУ, з’яўляючыся навуковай арганізацыяй, кіруецца ў сваёй дзейнасці Стратэгіяй развіцця навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

77. Акрэдытацыя БДПУ як навуковай арганізацыі ажыццяўляецца на ўмовах і парадку, які вызначаецца актамі заканадаўства.

78. Асноўнымі структурнымі падраздзяленнямі, якія забяспечваюць ажыццяўленне навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, з'яўляюцца інстытуты, факультэты, цэнтр развіцця педагагічнай адукацыі, каардынацыйны цэнтр «Адукацыя ў мэтах устойлівага развіцця», кафедры і навукова-даследчы сектар.

Арганізацыю, каардынацыю і суправаджэнне навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці БДПУ забяспечвае навукова-даследчы сектар.

79. Мэтай навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці БДПУ з’яўляецца нарошчванне навукова-даследчага патэнцыялу БДПУ як вядучага ўніверсітэта ў сферы бесперапыннай педагагічнай адукацыі для забеспячэння апераджальнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных работнікаў і ўстойлівага развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Асноўнымі задачамі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці БДПУ з’яўляюцца:

выкананне фундаментальных і прыкладных міждысцыплінарных навуковых работ па прыярытэтных напрамках псіхолага-педагагічных даследаванняў у сферы адукацыі;

забеспячэнне інтэграцыі навуковай і адукацыйнай дзейнасці шляхам рэалізацыі даследчага падыходу ў навучанні;

падрыхтоўка навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі для патрэб БДПУ і сістэмы адукацыі на аснове бесперапыннасці і пераемнасці;

развіццё навукова-даследчага асяроддзя і забеспячэнне эфектыўнага ўзаемадзеяння кампанентаў навуковай інфраструктуры БДПУ;

укараненне і распаўсюджванне ў сацыякультурнай сферы навуковых псіхолага-педагагічных ведаў і камерцыялізацыя вынікаў навукова-даследчай дзейнасці.

80. У БДПУ праводзяцца навуковыя мерапрыемствы, творчыя сустрэчы, агляды-конкурсы навуковых работ, універсітэцкія і рэспубліканскія алімпіяды студэнтаў. Структурныя падраздзяленні могуць

выступаць з ініцыятывай правядзення рэспубліканскіх і міжнародных навуковых мерапрыемстваў па актуальных праблемах даследаванняў.

81. Прафесарска-выкладчыцкі склад БДПУ праводзіць навуковыя даследаванні ў спалучэнні з адукацыйнай дзейнасцю.

82. Для разгляду пытанняў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці загадам рэктара БДПУ ствараецца Навукова-тэхнічны савет, які з'яўляецца калегіяльным органам кіравання і суправаджае навуковую, навукова-тэхнічную і інавацыйную дзейнасць структурных падраздзяленняў БДПУ па рашэнні найважнейшых праблем, накіраваных на рэалізацыю сацыяльна-эканамічных прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 7
МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І ЗНЕШНЕГАНДЛЁВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БДПУ

83. Міжнароднае супрацоўніцтва БДПУ ў сферы адукацыі накіравана на атрыманне адукацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацыях, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, у БДПУ, на абмен навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі, а таксама на ўдзел у міжнародных адукацыйных мерапрыемствах.

84. Міжнароднае супрацоўніцтва БДПУ ў сферы адукацыі ажыццяўляецца на аснове міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, дагавораў, што заключаюцца паміж БДПУ і замежнай арганізацыяй, міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, міжнародных і нацыянальных праектаў і праграм у сферы адукацыі.

85. Міжнароднае супрацоўніцтва БДПУ ў сферы адукацыі, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, двухбаковай выгады, узаемнай павагі і не павінна наносіць шкоды суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

86. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, маюць права на атрыманне адукацыі ў БДПУ ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, дагаворамі, якія заключаюцца паміж БДПУ і замежнай арганізацыяй, міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі

Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

